Весці БДПУ. Серыя 1. 2025. № 1. С. 138–142

УДК [001.82:398.3](476)

# МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ДАСЛЕДАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ АКАЗІЯНАЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ

**М. А. Шатарава,**
*кандыдат філалагічных навук,*
*загадчык кафедры мастацка-педагагічнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*
*ORCID: https://orcid.org/0009-0005-6024-0131*

Паступіў у рэдакцыю 13.11.2024.

UDC [001.82:398.3](476)

# METHODOLOGICAL ASPECTS OF STUDYING BELARUSIAN OCCASIONAL RITUALS

**M. Shatarova,**
*Candidate of Philological Sciences*
*Associate Professor of the Department of Theory and Methodology of Teaching Arts, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*
*ORCID: https://orcid.org/0009-0005-6024-0131*

Received on 13.11.2024.

У артыкуле на аснове аналізу тэарэтычных прац вядучых фалькларыстаў, этнографаў і лінгвістаў выяўлены метадалагічныя асновы і падыходы да вывучэння беларускай аказіянальнай абраднасці, вылучаны віды даследавання: пачатковы (зыходны), цэнтральны (асноўны) і апошні (выніковы), якія абумоўліваюць логіку залежнасці абрадавых элементаў ад першаасновы – крызіснай сітуацыі, што выклікала неабходнасць правядзення абрадаў.

*Ключавыя словы:* беларуская аказіянальная абраднасць, традыцыйная культура, метадалогія даследавання, абрадавы комплекс, крызісная сітуацыя.

Based on the analysis of theoretical works by leading folklorists, ethnographers and linguists, the article reveals the methodological foundations and approaches to studying Belarusian occasional rituals, highlights the levels of research: initial (initial), central (main) and final (final), determining the logic of the dependence of ritual elements on the primary basis - a crisis situation that caused the need to perform rituals.

*Keywords:* Belarusian occasional rituals, traditional culture, research methodology, ritual complex, crisis situation.

Аказіянальная абраднасць уяўляе сабой нерэгулярную частку беларускага абрадавага комплексу, якая звязана з рэакцыяй чалавека на тыя з'явы і падзеі, што парушалі звыклы ход яго жыцця і вызначаліся як крызісныя. Станоўчае вырашэнне гэтых крызісных ці крытычных сітуацый дасягалася праз звяртанне да звышнатуральных магчымасцей прыроды і людзей.

Аказіянальная абраднасць знаходзілася ў ракурсе ўвагі даследчыкаў фальклору, пачынаючы з XIX стагоддзя. Асобныя абрады запісаны беларускімі і расійскімі даследчыкамі мінулага стагоддзя (П. Шпілеўскі, Е. Раманаў, П. Шэйн, А. Сержпутоўскі, М. Нікіфароўскі, М. і С. Талстыя, К. Чыстоў і інш.), з аказіянальнымі абрадамі можна пазнаёміцца ў зборах сучасных фалькларыстаў (А. Байбурын, У. Васілевіч, М. Антропаў, Т. Валодзіна, У. Лобач). Аказіянальная абраднасць у гэтых работах разглядаецца ў кантэксце ўсёй славянскай культуры, у межах аналізу разнастайных жанраў традыцыйнай народнай культуры, у рамках разгляду асаблівасцей рытуальнага дзеяння, ужывання асобных прадметаў і інш.

М. і С. Талстыя вывучалі асобныя кампаненты славянскіх аказіянальных абрадаў, падрабязна разглядаючы аб'екты, атрыбуты, магічныя сродкі і спосабы выканання рытуалаў. Шмат сваіх работ даследчыкі прысвяцілі збіранню і аналізу разнастайных жанраў традыцыйнай народнай культуры беларускага Палесся, што дазволіла выдзеліць і ахарактарызаваць сярод іх абрады і рытуалы аказіянальнага характару. Навукоўцы з'яўляліся рэдактарамі і вядучымі аўтарамі серыі «Славянскі і балканскі фальклор», у розных выпусках якой быў апублікаваны шэраг артыкулаў, прысвечаных праблемам вывучэння асобных кампанентаў аказіянальнай абраднасці: рытуальных дзеянняў, магічных вербальных тэкстаў, спецыфіцы адбору выканаўцаў і інш. [1; 2]. Структурна-лагічны аналіз, які вызначае спецыфіку большасці даследаванняў традыцыйных абрадаў, у навуковых працах М. і С. Талстых дадаецца лінгвістычным і кампаратыўным. Моўныя асаблівасці вычляняюцца з мэтай выяўлення спецыфікі арганізацыі арыгінальных тэкстаў.

Рускі фалькларыст К. Чыстоў у сваіх даследаваннях вызначыў і прааналізаваў магчымасці і крытэрыі класіфікацыі славянскай абраднасці, вылучыў у асобныя самастойныя групы аказіянальныя і спецыялізаваныя абрады [3]. Розныя падыходы да класіфікацыі язычніцкіх абрадаў усходніх славян у абагуленым выглядзе разгледжаны рускім даследчыкам К. Паўлавым, які адначыў у сваёй рабоце, што вывучэнне і разуменне абрадаў дазваляе глыбей пазнаць язычніцтва як сістэму ўяўленняў [4].

Праблемай вывучэння рускіх «земляробчых абрадаў аказіянальнага тыпу» [5] на матэрыялах старажылаў і перасяленцаў Сібіры займалася даследчыца Г. Любімава. Яна параўноўвала элементы абраднасці розных народаў і этнічных груп, якія пражываюць у Сібіры, з рытуальнымі аказіянальнымі формамі, распаўсюджанымі на Палессі [5]. Даследчыца ў сваіх працах вызначала асаблівасці выкарыстання прылад працы

і прадметаў гаспадаркі ў якасці сродкаў абароны ад стыхійных бедстваў.

Залежнасць абрадаў ад крытычнай сітуацыі, якая парушае звыклы лад жыцця чалавека, разглядае расійская даследчыца Л. Ю. Ляпёшкіна ў артыкуле «Абрады жыццёвага цыкла як алгарытм пераадолення крытычных сітуацый». Яна вызначае, што абрад з'яўляецца «нестандартным» падыходам да пераадолення крытычнай сітуацыі, «паколькі традыцыйных варыянтаў барацьбы з ёй (малітваў, рытуальных песень) можа быць недастатковым» [6]. У якасці прыкладу прыведзены башкірскі абрад ахвяравання ў сувязі з эпідэміяй халеры, які па сваіх асаблівасцях з'яўляецца station аказіянальным. Разглядаючы абрады жыццёвага цыкла, аўтар адзначае ў якасці асноўнай прычыны іх правядзення выратаванне ад страху і невядомасці. Тут таксама трэба правесці паралелі з аказіянальнай абраднасцю, паколькі гэты від абрадаў асабліва моцна звязаны з крытычнай сітуацыяй, якая і выклікае пачуццё страху перад хваробай, перад смерцю, перад будучыняй і іншым.

Удалая спроба ўявіць асобныя элементы аказіянальных абрадаў у выразнай лагічнай схеме зроблена ў артыкуле навуковых супрацоўнікаў расійскага этнаграфічнага музея А. Лысенко і А. Астроўскага «Логические схемы окказиональных обрядов вызывания дождя Белорусского Полесья», у якім аўтары прыходзяць да высновы, што аказіянальныя абрады грунтуюцца на першабытным мысленні і валодаюць устойлівасцю ў функцыянаванні асобных рытуальных сімвалаў [7].

Важнай метадалагічнай распрацоўкай для даследавання традыцыйнай абраднасці з'яўляецца работа А. Байбурына «Рытуал у традыцыйнай культуры», у якой высвятляюцца сутнасныя характарыстыкі рытуала як дзейснага спосаба пераадолення чалавекам крызісных сітуацый. Аўтар прааналізаваў асноўныя тыпы ўсходнеславянскіх абрадаў, іх семіятычныя сродкі, структуру і функцыі, актуалізуючы праблему вызначэння месца рытуала ў сістэме традыцыйнай культуры. А. Байбурын раздзяліў рытуалы згодна з характарам іх сувязі з тымі сітуацыямі, якія іх выклікаюць: рытуалы жыццёвага цыкла, каляндарныя і аказіянальныя. Калі першыя выкліканы пераўтварэннямі ў сацыяльнай структуры (нараджэнне, вяселле, смерць), то другія і трэція – зменамі ў навакольным свеце (паваротныя пункты каляндарнага цыкла, эпідэміі, стыхійныя бедствы) [8, с. 22]. Даследчык адначыў, што аказіянальныя абрады, якія маглі праводзіцца штогод у памяць аб вызваленні ад крызіснай сітуацыі і станавіліся «абетнымі», такім чынам арганічна пераходзілі на іншы ўзровень – у склад каляндарных рытуалаў [8, с. 18–19]. У сваёй кнізе А. Байбурын таксама вызначыў спецыфіку крызіснай сітуацыі ў тым, што яна з'яўляецца вынікам парушэння раўнавагі паміж «сваім» светам і «чужым»: «У рытуале пры дапамозе серыі абменаў страчаная раўнавага аднаўляецца, прычым гэта аднаўленне з'яўляецца адначасова і пераўтварэннем, якое часцей усяго інтэрпрэтуецца ў традыцыйнай культуры як смерць – адраджэнне» [8, с. 148]. Такім чынам, аўтар адначыў, што характэрныя рысы рытуала будуць істотна залежаць ад таго, якія сілы «вінаватыя» ў парушэнні звыклага ладу жыцця. Асноўнымі прычынамі правядзення аказіянальных рытуалаў, што ўплываюць на яго далейшую структуру, аўтар называе парушэнні мяжы «чужымі» сіламі і паслабленне самой мяжы [8, с. 148]. Асаблівую ўвагу ён удзяляе вызначэнню ўласцівасцей «мяжы», як асноўнай катэгорыі рытуальных тэкстаў: «аддзяляць часткі прасторы і забяспечваць рэгламентаваную сувязь паміж імі» [8, с. 188].

Беларускі навуковец М. Антропаў у артыкуле «Беларускія этналінгвістычныя эцюды: 2. Вызыванне дажджу (акцыянальны код)» падкрэсліў «незвычайную актуальнасць у мінулым абрадаў і рытуалаў, звязаных з выклікannем дажджу» [9, с. 192]. На падставе аналізу матэрыялаў архіва «Беларускага этналінгвістычнага атласа», якія адносяцца да плювіяльнай магіі, аўтар выдзяляе спецыфічныя і неспецыфічныя, а таксама суправаджальныя абрадавыя дзеянні. Сярод спецыфічных абрадавых дзеянняў ён вызначае правядзенне магічных дзеянняў ля калодзежа (асвячэнне калодзежа, ахвяры і інш.), ля крыніцы (ачышчэнне, ахвяры, маленне, абворванне і інш.), рытуальнае калачэнне вады або гаршкоў, выкідванне ў ваду розных прадметаў, рытуальнае ўтапленне, кіданне жабы ў малако або глыбокія ямы, імітатыўную магію з вадой (абліванне, пераносенне вады ў рэшаце і інш.), магічныя дзеянні на могілках, з мурашнікам, рытуальныя забойствы, сімвалічныя пахаванні, абворванне рэк і дарог [9, с. 192–197]. М. Антропаў падае сабраны матэрыял у выглядзе абагульняючых карт, якія ў графічнай форме пацвердзілі вывад пра тое, што «аснову беларускіх абрадаў і рытуалаў, звязаных з магічным выклікannем дажджу, складаюць зафіксаваныя ў 250 (з 266: 94 %) пунктах спецыфічныя абрадавыя дзеянні, дыферэнцыраваныя па 13 пазіцыях. Хаця дзеянні не спецыфічныя, г. зн. якія сустракаюцца і ў другіх абрадава-рытуальных комплексах, значна больш разнастайныя – дыферэнцыяваны па 19 пазіцыях – яны ўсё ж маюць дапаўняльны характар» [9, с. 201]. У даследаваннях М. Антропава аказіянальны абрад вылучаецца як самадастатковы элемент традыцыйнай культуры беларусаў, што функцыянуе ў асяроддзі жыццядзейнасці чалавека ва ўмовах крызіснай сітуацыі. Распрацаваная фалькларыстам карта абраду выклікання дажджу прадвызначыла падыходы да класіфікацыі аказіянальных абрадаў у залежнасці ад віду крызіснай сітуацыі [10].

Асобныя кампаненты аказіянальнай абраднасці ў ракурсе даследавання розных фальклорных жанраў разгледжаны ў работах беларускага фалькларыста Т. Валодзінай. У яе кнізе «Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў» па-

драбязна разглядаецца спецыфіка рытуальнага функцыянавання прадметаў хатняга ўжытку. Сярод іншых аўтар разглядае тыя рэчы, якія выкарыстоўваліся ў аказіянальных абрадах, а таксама сімвалічнае прызначэнне бытавых прадметаў. Напрыклад, рэшата, якое паводле народнага ўяўлення метафарычна суадносілася з небам або аблокамі. Гэтаму прадмету надаваліся магічныя ўласцівасці ў абрадах выклікання дажджу (насілі ваду ў рэшаце) або сканчэння дажджу (перавернутае сіта): «Вадзе, пралітай праз сіта, прыпісвалася здольнасць затушыць не толькі нябесны агонь, але і зямны – пажар» [11, с. 31]. Ахарактарызавана і семантыка такіх прадметаў, як хлебная лапата, качарга, і вілы, якія мелі важнае значэнне ў звычаях засцярогі ад граду і дажджу, а таксама барана – у рытуальным абворванні дарогі, вёскі, вадаёму падчас засухі і эпідэмій [11, с. 46, 60]. Спецыфіку талочнай традыцыі, якая мела важнае значэнне ў правядзенні такіх аказіянальных абрадаў, як стварэнне «абыдзённіка» і будаўніцтва хаты, аналізуе Т. Валодзіна ў сваёй кнізе «Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў». Аўтар характырызуе талочную традыцыю ва ўзаемасувязі з міфапаэтычнымі ўяўленнямі продкаў, вызначае структурныя элементы і разнастайнасць тыпаў талакі [12].

Важная роля аказіянальных абрадаў у захаванні культурных адметнасцей нацыі адзначана ў артыкуле Т. Валодзінай і Т. Кухаронак «Народныя традыцыі ў сучасным святочным календары беларусаў: дзяржаўныя і грамадскія ініцыятывы», у якім разгледжана спецыфіка беларускага каляндарна-абрадавага комплексу у сувязі з тэндэнцыямі фарміравання сучаснага святочнага календару Рэспублікі Беларусь. Аўтары вызначаюць бытаванне ў сучасны час аўтэнтычных, адноўленых і пастановачных святаў і абрадаў. У артыкуле прадстаўлена апісанне абыдзённага абраду «Намётка», які праводзіўся жыхарамі вёскі Папшычы Глыбоцкага раёна ў памяць пра вызваленне вёскі ад халеры ў пачатку XX ст. у выніку правядзення аказіянальнага абраду – вырабу аброчнай тканіны (намёткі) і наладжванню хрэснага ходу вакол вёскі з ёй. «Здзяйсненне абыдзённага рытуала спалучаецца з шанаваннем продкаў, спрыяе выхаванню паважлівых адносінаў да продкаў і захаванню сваёй культурнай адметнасці. Выраб намёткі і шэсце з ёй, а таксама калектыўнае ахвяраванне рэпрэзентуюць акт калектыўнага волевызвалення і звароту да вышэйшых сілаў» [13, с. 77]. Таксама ў артыкуле прааналізаваны аказіянальны абрад выклікання дажджу, які праводзіўся ў вёсцы Стары Дзедзін Клімавіцкага раёна адпаведна «магічным універсаліям традыцыйнай культуры, у традыцыі вытрыманы ўсе складовыя часткі абраду» [13, с. 81]. Аўтары адзначаюць сучаснае ўспрыманне абраду, як важную адметнасць народнай культуры рэгіёна, акцэнтуюць увагу на тым, што дзейнасць па аднаўленню абрадаў і звычаяў з'яўляецца моцным стымулам для падтрымкі носьбітаў аўтэнтычнай культуры: «мясцовая супольнасць выразна ўсведамляе каштоўнасць гэтай традыцыі, яе ролю ў захаванні раўнавагі і светаладу ў межах універсальнай гнасеалагічнай мадэлі “Чалавек – Сусвет”» [13, с. 82].

Відавочна, што даследчыкі вызначаюць аказіянальную як адну з найменш вывучаных сфер славянскай абраднасці, нягледзячы на тое, што гэтая група абрадаў утрымлівае ў сабе найбольш архаічныя элементы традыцыйнай культуры, цесна пераплецена з рэлігійнымі ўяўленнямі чалавека, яго патрэбамі, клопатамі, спадзяваннямі. Па выніках аналізу тэарэтычных прац вядучых фалькларыстаў, этнографаў і лінгвістаў выяўляюцца метадалагічныя падыходы да вывучэння беларускіх аказіянальных абрадаў у кантэксце пазнання традыцыйнай культуры ў цэлым.

У аснову даследавання аказіянальнай абраднасці пакладзены *структуралісцкі* падыход (у яго класічнай трактоўцы, вылучанай У. Я. Пропам). У якасці першаснай асновы культуры разглядаецца абрадавы комплекс, які складаецца з мноства кампанентаў, што знаходзяцца ў бесперапыннай ўзаемасувязі і ўзаемаўплыве. Пры гэтым вылучэнне асобных груп абрадаў грунтуецца на трох асноўных фактарах: аб'екце абрадавага ўздзеяння, часе правядзення і функцыі абраду. У адпаведнасці з імі выдзяляюцца групы абрадаў: каляндарныя, сямейныя і аказіянальныя. Вылучэнне аказіянальных абрадаў у асобную групу заснавана на акрэсленасці іх залежнасці ад крызіснай сітуацыі (аб'ект), рухомасці часу правядзення (час) і ахоўна-ачышчальнай скіраванасці (функцыя). Неабходна адзначыць, што аказіянальныя абрады знаходзяцца ў асаблівай ўзаемасувязі з іншымі групамі. Групы сямейных і каляндарных абрадаў уяўляюць сабой верхні ўзровень абрадавага комплексу ў сувязі з тым, што мелі абавязковы характар выканання і праводзіліся абавязкова і ў тым аб'ёме, які быў традыцыйна ўласцівы пэўнаму рэгіёну. Правядзенне аказіянальных абрадаў мела сітуацыйны характар, залежала ад магчымасці ўзнікнення крызіснай сітуацыі. Таму яны маглі не праводзіцца ці праводзіцца не ў поўным аб›ёме, калі крызіс не адбываўся. Пры гэтым аказіянальныя абрады маглі пераходзіць на больш высокі ўзровень (у выпадку іх правядзення ў вызначаны час у памяць пра пераадоленне крызісу), што сведчыць пра магчымасць змены абраду па вертыкалі.

Згодна з тэарэтычнымі палажэннямі структуралізму, аказіянальныя абрады ўключаюць інварыянтныя кампаненты, якія знаходзяцца ва ўзаемасувязі, і разглядаюцца на трох узроўнях. Пачатковы (зыходны) узровень вызначае падзейная абумоўленасць, якая ўключае характарыстыкі крызіснай сітуацыі, што выклікае правядзенне абраду. На гэтым узроўні адбываецца відавая дыферэнцыяцыя аказіянальных абрадаў, абу-

моўленая спецыфікай крызісу: вылучаюцца метэаралагічныя, ахоўна-лекавыя, бытавыя, сацыяльна скіраваныя абрады [10].

На цэнтральным (асноўным) узроўні вылучаюцца: 1) склад дзеючых асоб (персаніфікацыя), рытуальныя патрабаванні да іх і кола іх «абавязкаў»; 2) інструментарый абраду (рытуальныя прадметы, жывыя істоты, стыхіі, што ўключаны ў абрадавае дзеянне); 3) рытуальныя тэксты (заклінанні, галашэнні, прыгаворы, замовы і інш.). На дадзеным узроўні прадстаўлены ўсе кампаненты, якія пры выкананні ўсіх традыцыйных патрабаванняў да іх ва ўзаемасувязі забяспечваюць паспяховасць правядзення абраду і пераадоленне крызісу. На апошнім (выніковым) узроўні адбываецца ацэнка выніковасці і вызначэнне перспектыў абрадаў у лакальнай экзістэнцыі або ў каляндарна-часавых адносінах.

*Аксіялагічны* падыход, які мае ў аснове інтэрпрэтацыю каштоўнасцей культуры ў рэаліях часу, выкарыстоўваецца на этапах выяўлення вытокаў аказіянальных абрадаў, раскрыцця сутнасці іх экзістэнцыі, ацэнкі вынікаў іх здзяйснення з мэтай устанаўлення прычынна-выніковых сувязяў паміж сутнасцю і з'явай. Сам аказіянальны абрад, узяты паасобку, як і абрадавы комплекс, што адбываецца па аказіі, трактуецца як каштоўнасная катэгорыя традыцыйнай народнай культуры. Абрадавае дзеянне разглядаецца ў кантэксце сацыякультурнай сітуацыі ва ўзаемасувязі з магчымым і сапраўдным. Апора на практыкаарыентаваны падыход вызначае апеліраванне да асноў неааксіялогіі. Непасрэдна аказіянальны абрадавы комплекс, як і носьбіты абрадавых дзеянняў, трактуецца (згодна з В. А. Салеевым [14, с. 409]) як каштоўнасць культуры. Ацэнка нараджаецца ў працэсе фалькларызацыі абраду.

Аказіянальны абрад сам па сабе, абстрактна ўзяты (па-за кантэкстам сітуатыўнай абумоўленасці), мысленча змадэліраваны, паўстае як феномен культуры народа, што вызначае зварот у даследаванні яго сутнасці, апору на *фенаменалагічны* падыход. У працэсе мысленчага канструіравання кантэкстуальна вызначанай сітуацыі канкрэтна ўзятага аказіянальнага абраду раскрываюцца паэтычныя асновы яго экзістэнцыі, што дазваляе «перанесціся» ў месца і час яго здзяйснення і праз Dasein узнавіць карціну таго, што адбываецца. Фенаменалагічны падыход прадугледжвае выкарыстанне метаду трансцэндэнтальнай рэдукцыі, на ўзроўні якога выяўляюцца базісныя кампаненты аказіянальных абрадаў, што адлюстроўваюць спецыфіку іх існасці.

У даследаванні традыцыйнай культуры мэтазгодна апора на выкарыстанне *комплекснага* падыходу ў вызначэнні спецыфікі і сутнасці беларускай аказіянальнай абраднасці, якая разглядаецца як цэласная сістэма, у сукупнасці ўсіх элементаў (дзеянняў, слоў, рухаў, магічных сімвалаў і інш.). Пры гэтым важным з'яўляецца абагульненне семантыкі ўсіх абрадавых кампанентаў, у тым ліку фальклорных тэкстаў як цэнтральнага стрыжня, у якім выяўляецца магічны сэнс. Комплекснае вывучэнне беларускай аказіянальнай абраднасці як часткі традыцыйнай культуры дазваляе вызначыць яе сутнасць і структуру, раскрыць механізмы трансляцыі дадзенага віду абраднасці з пакалення ў пакаленне.

Метадалагічную базу даследавання беларускай аказіянальнай абраднасці складае сістэмны аналіз аказіянальнай абраднасці ў складзе беларускага абрадавага комплексу, што прадугледжвае не толькі тэарэтычны, але і эмпірычны ўзроўні. На эмпірычным узроўні ў якасці крыніц атрымання факталагічных дадзеных выкарыстоўваюцца архіўныя матэрыялы фальклорна-этнаграфічных экспедыцый, навуковыя матэрыялы і рэсурсы аддаленага доступу.

Такім чынам, даследаванне беларускай аказіянальнай абраднасці ўяўляецца на трох узроўнях: пачатковым (зыходным), цэнтральным (асноўным) і апошнім (выніковым), якія абумоўліваюць структурную будову комплексу і ўзаемасувязі абрадавых кампанентаў. Дадзеная структура раскрывае логіку залежнасці абрадавых элементаў ад першаасновы – крызіснай сітуацыі, якая выклікала неабходнасць правядзення абрадаў, а таксама цэласнасць і ўстойлівасць усяго аказіянальнага абраду. Вывучэнне аказіянальнай абраднасці павінна абапірацца на аксіялагічны і фенаменалагічныя падыходы, якія вызначаюць даследаванне дадзеных артэфактаў традыцыйнай культуры як сістэмы базавых каштоўнасцей і феноменаў свядомага жыцця. Адметнасць беларускай аказіянальнай абраднасці выяўляецца ў відавочнай наяўнасці і трываласці ў ёй найбольш архаічных элементаў традыцыйнай культуры, якія ўтрымліваюць вечныя і бясспрэчныя каштоўнасці жыцця.

*Літаратура*

1. Славянский и балканский фольклор : Обряд. Текст : Сборник статей / АН СССР, Ин-т славяноведения и балканистики; Редкол. : Н. И. Толстой (отв. ред.) [и др.]. – М. : Наука, 1981. – 277 с.
2. Славянский и балканский фольклор : Этнолингвистическое изучение Полесья : Сборник / АН СССР, Ин-т славяноведения и балканистики ; редкол. : Н. И. Толстой (отв. ред.) [и др.]. – М. : Индрик, 1995. – 399 с.
3. *Чистов, К. В.* К классификации обрядов жизненного цикла / К. В. Чистов // Язычество восточных славян. – Л. : Наука, 1990. – С. 101–107.

*References*

1. Slavyanskij i balkanskij fol'klor : Obryad. Tekst : Sbornik statej / AN SSSR, In-t slavyanovedeniya i balkanistiki; Redkol. : N. I. Tolstoj (otv. red.) [i dr.]. – M. : Nauka, 1981. – 277 s.
2. Slavyanskij i balkanskij fol'klor : Etnolingvisticheskoe izuchenie Poles'ya : Sbornik / AN SSSR, In-t slavyanovedeniya i balkanistiki ; redkol. : N. I. Tolstoj (otv. red.) [i dr.]. – M. : Indrik, 1995. – 399 s.
3. *Chistov, K. V.* K klassifikacii obryadov zhiznennogo cikla / K. V. Chistov // Yazychestvo vostochnyh slavyan. – L. : Nauka, 1990. – S. 101–107.

4. *Павлов, К. А.* Взгляды современных отечественных ученых на языческие обряды и празднества восточных славян / К. А. Павлов // Грамота. – 2011. – № 5 (11): в 4-х ч. Ч. II. – С. 132–136. – URL: www.gramota.net/materials/3/2011/5-2/33.html (дата обращения : 18.12.2024).
5. *Любимова, Г. В.* Способы борьбы с засухой в традиционной обрядности русских крестьян Западной Сибири / Г. В. Любимова // Гуманитарные науки в Сибири: всероссийский научный журнал. Серия: Археология и этнография. – № 3. – 1997. – URL: http://x.archaeology.nsc.ru/Home/pub/Data/?html=gn9.htm&id=361 (дата обращения : 25.12.2024).
6. *Лепешкина, Л. Ю.* Обряды жизненного цикла как алгоритм преодоления критических ситуаций / Л. Ю. Лепешкина // «КиберЛенинка». Научная онлайн-библиотека. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/obryady-zhiznennogo-tsikla-kak-algoritm-preodoleniya-kriticheskih-situatsiy (дата обращения : 27.11.2024).
7. *Лысенко, О. В.* Логические схемы окказиональных обрядов вызывания дождя Белорусского Полесья / О. В. Лысенко, А. Б. Островский // Язычество восточных славян. Сборник научных трудов. – Л. : Ленинград, 1990. – С. 108–119.
8. *Байбурин, А. К.* Ритуал в традиционной культуре / А. К. Байбурин. – Рос. АН, Музей антропологии и этнографии им. Петра Великого (Кунсткамера). – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.
9. *Антропов, Н. П.* Белорусские этнолингвистические этюды: 2. Вызывание дождя (акциональный код) / Н. П. Антропов // Язык культуры: Семантика и грамматика. К 80-летию со дня рождения академика Никиты Ильича Толстого (1923-1996) / Отв. ред. С. М. Толстая. – М. : Индрик, 2004. – С. 190–216.
10. *Шатарава, М. А.* Сутнасць, спецыфіка і склад беларускай аказіянальнай абраднасці ў прызме часу / М. А. Шатарава // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 30 / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2021. – С. 338–345.
11. *Валодзіна, Т. В.* Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т. В. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 1999. – 167 с.
12. *Валодзіна, Т. В.* Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў / Т. В. Валодзіна / Акад. навук Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – 135 с.
13. *Валодзіна, Т. В.* Народныя традыцыі ў сучасным святочным календары беларусаў: дзяржаўныя і грамадскія ініцыятывы / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак // Народна творчість та етнологія. – 2017. – № 2. – С. 63–85.
14. *Салеев, В. А.* Аксиология и неоаксиология / В. А. Салеев // Философия и ценности современной культуры: материалы Международной научной конференции, Минск, 10–11 октября 2013 г. – Минск : БГУ, 2014. – С. 407–409.

4. *Pavlov, K. A.* Vzglyady sovremennyh otechestvennyh uchenyh na yazycheskie obryady i prazdnestva vostochnyh slavyan / K. A. Pavlov // Gramota. – 2011. – № 5 (11): v 4-h ch. Ch. II. – S. 132–136. – URL: www.gramota.net/materials/3/2011/5-2/33.html (data obrashcheniya : 18.12.2024).
5. *Lyubimova, G. V.* Sposoby bor'by s zasuhoj v tradicionnoj obryadnosti russkih krest'yan Zapadnoj Sibiri / G. V. Lyubimova // Gumanitarnye nauki v Sibiri: vserossijskij nauchnyj zhurnal. Seriya: Arheologiya i etnografiya. – № 3. – 1997. – URL: http://x.archaeology.nsc.ru/Home/pub/Data/?html=gn9.htm&id=361 (data obrashcheniya : 25.12.2024).
6. *Lepeshkina, L. Yu.* Obryady zhiznennogo cikla kak algoritm preodoleniya kriticheskih situacij / L. Yu. Lepeshkina // «KiberLeninka». Nauchnaya onlajn-biblioteka. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/obryady-zhiznennogo-tsikla-kak-algoritm-preodoleniya-kriticheskih-situatsiy (data obrashcheniya : 27.11.2024).
7. *Lysenko, O. V.* Logicheskie skhemy okkazional'nyh obryadov vyzyvaniya dozhdya Belorusskogo Poles'ya / O. V. Lysenko, A. B. Ostrovskij // Yazychestvo vostochnyh slavyan. Sbornik nauchnyh trudov. – L. : Leningrad, 1990. – S. 108–119.
8. *Bajburin, A. K.* Ritual v tradicionnoj kul'ture / A. K. Bajburin. – Ros. AN, Muzej antropologii i etnografii im. Petra Velikogo (Kunstkamera). – SPb. : Nauka, 1993. – 240 s.
9. *Antropov, N. P.* Belorusskie etnolingvisticheskie etyudy: 2. Vyzyvanie dozhdya (akcional'nyj kod) / N. P. Antropov // Yazyk kul'tury: Semantika i grammatika. K 80-letiyu so dnya rozhdeniya akademika Nikity Il'icha Tolstogo (1923-1996) / Otv. red. S. M. Tolstaya. – M. : Indrik, 2004. – S. 190–216.
10. *Shatarava, M. A.* Sutnasc', specyfika i sklad belaruskaj akaziyanal'naj abradnasci ŭ pryzme chasu / M. A. Shatarava // Pytanni mastactvaznaŭstva, etnalogii i fal'klarystyki. Vyp. 30 / Centr dasledavannyaŭ belaruskaj kul'tury, movy i litaratury NAN Belarusi ; navuk. red. A. I. Lakotka. – Minsk : Prava i ekanomika, 2021. – S. 338–345.
11. *Valodzina, T. V.* Semantyka rechaŭ u duhoŭnaj spadchyne belarusaŭ / T. V. Valodzina. – Minsk : Tekhnalogiya, 1999. – 167 s.
12. *Valodzina, T. V.* Talaka ŭ sisteme duhoŭnaj kul'tury belarusaŭ / T. V. Valodzina / Akad. navuk Belarusi. In-t mastactvaznaŭstva, etnagrafii i fal'kloru. – Minsk : Belaruskaya navuka, 1997. – 135 s.
13. *Valodzina, T. V.* Narodnyya tradycyi ŭ suchasnym svyatochnym kalendary belarusaŭ: dzyarzhaŭnyya i gramadskiya inicyyatyvy / T. V. Valodzina, T. I. Kuharonak // Narodna tvorchist' ta etnologiya. – 2017. – № 2. – S. 63–85.
14. *Saleev, V. A.* Aksiologiya i neoaksiologiya / V. A. Saleev // Filosofiya i cennosti sovremennoj kul'tury: materialy Mezhdunarodnoj nauchnoj konferencii, Minsk, 10–11 oktyabrya 2013 g. – Minsk : BGU, 2014. – S. 407–409.

DRAFT